Калі сезон год корміць

«Чорныя не бяруць. А гэта сорт такі!»

Арганізаваны рынак у аграгарадку Дварэц працуе трэці год. Раней прадаўцы стыхійна выстройваліся ўздоўж дарог. Аляксандр Іванавіч успамінае: пяць вуліц ад плошчы адходзяць — усе забіты машынамі. Цяпер на ўзбочыне таксама гандлююць, але так, па дробязях — хто слоік ягад прадае, хто вядро.

Цэны на рынку скачуць на працягу дня. З раніцы кілаграм клубніц могуць браць па 3,50 рубля, увечары — па паўтара. Чым больш прадаўцоў, тым меншая цана. Сёння скупшчыкі пераборлівыя. За буйныя ягады прапануюць у сярэднім 1,50 рубля, у пяску нават за капейкі не прымаюць.

Школьнікі Вадзім ПАШКЕВІЧ і Алег СТАХМІЧ дапамагаюць загружаць клубніцы.

— У мяне клубніцы браць не хочуць. Кажуць, чорныя. А гэта сорт такі! — уздыхае пенсіянерка, якая на веласіпедзе прыцягнула з агарода пару поўных вёдзер.

— Лепш дзяржаўным нарыхтоўшчыкам здаваць, яны больш плацяць, — заўважае яе пажылая суразмоўніца і бядуе: на лекі б крыху зарабіць.

Машын райспажыўтаварыства між тым ужо няма. Яны стараюцца закупіцца з самай раніцы, да 10 гадзін, каб у абед у сябе на рынку прадаваць. Клубніцы ж доўга чакаць не будуць, псуюцца хутка.

Вясковец Васіль Коўшык затанна прадаваць свой ураджай не гатовы. Таргуецца.

— Вы паглядзіце, якая ягада добрая. Па два рублі за кілаграм аддам.

— Гэта вам здаецца, што добрая. Па дарозе растрасецца, — не ўступае ў цане нарыхтоўшчык.

— Ну тады далей пайду.

Васіль Коўшык некалі паліў лазню ў Дварцы. Потым лазня закрылася (нерэнтабельнай стала), а ён — на пенсію. Пад клубніцы ў мужчыны сотак дзесяць выдзелена. Які сорт? Не ведае, жонка гэтым займаецца. Праз некалькі машын вяскоўцу нарэшце пашанцавала: пагадзіліся на яго цану.

Сярод скупшчыкаў — лунінчане Людміла Раковіч са свёкрам Андрэем. Яны толькі першы год у салодкім бізнесе. Сёння вось 500 кілаграм загрузілі, ноччу павязуць у Расію — раніцай трэба быць там. Колькі спадзяюцца зарабіць? Людміла глабальных мэт не ставіць: дзяцей хоць бы ў школу адзець.

Пра заробкі тут у прынцыпе расказваюць неахвотна. Але па чутках клубнічны сезон нядрэнна корміць: хто на машыну збірае, хто на кватэру.

«Збіраю на адпачынак на моры»

Мясцовыя школьнікі на канікулах не сядзяць без справы. Хлопцы Вадзім Пашкевіч і Алег Стахміч на клубніцах не першы год. Дапамагаюць знаёмым загружаць скрыні з ягадамі ў машыну.

— У Маскву паедзе, там на розніцы курсаў выйграем, — з веданнем справы разважаюць лунінецкія школьнікі.

За адну машыну хлопцам плацяць па 20 рублёў. Тыя не трацяць — запасяць. Дзевяцікласнік Алег — на адпачынак на моры.

— А ты на што? — пытаемся ў Вадзіма, які ўвосень пойдзе ў восьмы клас. — Мо, на веласіпед?

— Не, велік у мяне ёсць. Рахунак думаю адкрыць.

Сур'ёзны падыход.

Нарыхтоўшчык Дзмітрый Ляўшук закупляецца для аднаго з віцебскіх рынкаў. За сёння загрузіў паўтары тоны. А ўсяго ў плане — 10 тон паставіць.

Побач машына Валерыя Дашкевіча. Прадаваць клубніцы павязе на мінскі рынак Ждановічы. Ураджай са свайго ўчастка мужчына таксама прадае. Сорт «ханоя», кажа, захоўваецца добра.

— Пакаштуйце, якая салодкая, — прапануе нам ацаніць буйныя прыгожыя ягады. Салодкія. Сёлета, кажуць агароднікі, смак што трэба: дажджоў мала было, таму клубніцы не вадзяністыя.

Валерый жыве ў Дварцы. Клубніцамі гадоў 20 займаецца. Засадзіў імі 18 сотак. За сённяшнюю раніцу ўдваіх з жонкай кілаграм 300 з участка сабралі.

— Колькі часу гэта заняло? — мужчына задумваецца. — З чатырох да адзінаццаці раніцы на гародзе былі. Хутка, думаеце? Гэта пры тым раскладзе, што клубніцы добрыя: вялікія, сухія. Калі такое надвор'е халаднаватае будзе, сезон на паўтара месяцы зацягнецца.

Працуе Валерый кіроўцам на аўтабазе, яго жонка — выхавацелем у дзіцячым садку. На чэрвень водпуск узялі (на Лунінеччыне хто-небудзь увогуле ў гэты месяц на рабоце застаецца?).

— А што рабіць, жыць неяк трэба, на хлябок зарабляць. Вось дзеці ў Мінск пераязджаць збіраюцца, кватэру купілі.

«Ханоя», бадай, самы хадавы сорт на рынку. Пенсіянерка Вольга Аляксееўна Косач таксама яго вырошчвае. «А мы ведаем, колькі тымі клубніцамі займаемся, — адмахваецца яна. — З 1972 года, палічыце самі».

Сёння Вольга Аляксееўна прывезла на рынак 26 скрыняў. Збіралі разам з мужам і сынам. Пахадзілі па машынах, папыталі, дзе даражэй возьмуць, і ў выніку прадалі за 1,80 рубля за кілаграм.

— І не шкада так танна аддаваць?

— А дзе ж мы дзенемся? — разводзіць рукамі бабуля. — Гэта не бульба, што паляжаць можа. Зараз не прадасі — потым пад агароджу высыпай. Цэны дыктуе рынак.

Рухавай пенсіянерцы 65 гадоў. На клубніцах яна шчыруе штодзень. Стымулюе прыбаўка да пенсіі, усміхаецца Вольга Аляксееўна.

60 тон ураджаю

Паток машын на рынку не спыняецца. Раз-пораз заторы. Прадаўцы скардзяцца: зрабіць бы яшчэ заезд арганізаваны, каб аварый менш было.

Многія незадаволены фітасанітарным кантролем (пашпарт на прадукцыю патрэбны, калі вязеш на продаж у Расію). А калі дакладна — тым, што працуе ён толькі да 17.00. Мы заходзілі за гадзіну да закрыцця. Сапраўды: чарга — не прабіцца.

— Рынак жа да дзесяці вечара адкрыты. Маглі б дзяжурнага тут пасадзіць, хоць бы да васьмі, — прапануе адзін з нарыхтоўшчыкаў.

На рынак на бусе заязджае чарговы прадавец. Васіль (прозвішча называць не захацеў) вырошчвае клубніцы, можна сказаць, у прамысловых маштабах: участак на тры гектары. Прызнаецца, што з аднаго гектара за сезон 20 тон ураджаю атрымлівае. Выбірае праз дзень-два. Не сваімі сіламі, вядома, наймае людзей. За гадзіну выбаркі плацяць у асноўным 2,50 рубля. Ахвотных падпрацаваць, кажуць, хапае.

— Цяпер холадна, ягада да восені будзе, — заўважае фермер. — Потым бульба, морква. Але я вам так скажу: калі добра клубнічны сезон адпрацаваць, то можна год адпачываць, да наступнага лета.

Чым мясцовыя жыхары восенню і зімой на жыццё зарабляюць, пытаемся пасля ў Аляксандра Віднікевіча. Старшыня сельсавета расказвае, што многія ў Расію працаваць едуць. Ці на сезонныя работы ў аграгарадку ўладкоўваюцца. У сельсавеце, напрыклад, пяць школ: туды ў кацельныя людзі патрэбны будуць, па шэсць чалавек на кожную. Ужо для 30 вяскоўцаў работа ёсць.

Тут сяло не пусцее. Наадварот нават: штогод сельсавет па 10—12 новых дамоў здае. Не па 30, вядома, як некалі было, але ж. Не раз'язджаюцца, пакуль зямля корміць.

Лунінецкі раён.

Запрашальнік

24 чэрвеня ў аграгарадку Дварэц пройдзе раённае свята «Лунінецкія клубніцы». Як расказала»Звяздзе» **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Наталля АКСЁНАВА**, на фестывалі будуць арганізаваны выстава-продаж гастранамічных вырабаў з ягад, кірмаш майстроў дэкаратыўна-прыкладной і народнай творчасці. Кожны сельвыканкам (іх у раёне 11) рыхтуе свой стылізаваны падворак.

Адкрыецца свята тэатральным шэсцем «Клубнічны парад». Гасцей чакае канцэртная праграма: паказ мод, спектакль, выступленні калектываў Лунінецкага, Столінскага, Ганцавіцкага, Пружанскага, Жабінкаўскага раёнаў. На спартыўнай паляне можна будзе паспрабаваць свае сілы ў перацягванні каната і іншых спаборніцтвах. Завершыцца фестываль дыскатэкай, якая прадоўжыцца да 23.00.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. *lubneuskaya@zvizda.by*
Фота Надзеі БУЖАН.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. №401/С-24907 (назначение – здание специализированное культурно-просветительского и зрелищного назначения, наименование – дом культуры), площадью 447,8 кв. м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Глиняны, ул. Первомайская, 14. Составные части и принадлежности: навес теневой, сарай, уборная, дымовая труба
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422088504101000196, (назначение – земельный участок для обслуживания здания клуба), площадью 0,1605 га, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Скидельский с/с, д. Глиняны, ул. Первомайская, 14. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2 (0,0038 га); земли, находящиеся в водоохранной зоне водных объектов, код – 4,1 (0,1605 га)
Начальная цена продажи	97 344,27 р. (девяносто семь тысяч триста сорок четыре рубля двадцать семь копеек) с учетом НДС
Сумма задатка	9 734 р. (девять тысяч семьсот тридцать четыре рубля)
Условия аукциона	Аукцион без условий
Продавец	ОАО «Агрокомбинат «Скидельский», Филиал «Скидельский» 231761, г. Скидель, ул. Кизевича, 36. Тел./факс 8-0152-97-78-92
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225

Аукцион состоится 20 июля 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 17 июля 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона), по поручению Узденского райпо (продавец), проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества:

Лот 1. Здание магазина, общ. пл. **87,0 кв. м**, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 №5643, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683205101000027, площадью 0,0771 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Каменое.**

Начальная цена с НДС – **6 634,80** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 663,00 бел. руб.). Стоимость снижена на 50%.

Лот 2. Здание магазина, общ. пл. 112,0 кв. м, регистрационное удостоверение от 04.05.1999 №5649, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625683208201000070, площадью 0,0783 га (предоставлен на праве постоянного пользования) по адресу: **Минская область, Узденский район, Слободской с/с, д. Старые Морги**.

Начальная цена с НДС – **10 222,44** бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 1 022,00 бел. руб.). Стоимость снижена на 50%.

Задатки перечисляются на р/с 3012108260016 в ЦБУ №701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 20 (двадцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель). Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 12.04.2017. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Аукцион состоится **04.07.2017** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **30.06.2017** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.